© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

ВОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA" („VATERLAND")

Herausgeber: Wladimir BORTNIK

Postadresse: Die Weissruthenische Zeitung „Baćkauščyna" („Das Vaterland"), (13 b) München 19, Schliessfach 69.

Druck: „LOGOS", Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 19, Bothmerstr. 14

Цана: Нямеччына: на год — 14,— м.; 6 м-цаў — 7,50 м.; 3 м-цы — 4,25 м.; **ЗША і Канада:** на год — 8,— д.; 6 м-цаў — 4,50 д.; 3 м-цы — 2,50 д.; 1 нумар — 0,20 д. **Ангельшчына й Аўстралія:** 39 шыл.; 21 шыл.; 12 шыл.; 1 шыл. **Бэльгія:** 210 фр.; 120 фр.; 75 фр.; 5 фр. **Францыя:** 800 фр.; 450 фр.; 250 фр.; 20 фр. **Аргентына:** 80 пэз.; 45 пэз.; 25 пэз.; 2 пэз. **Перасылка лётніцкай поштай аднаго нумару газэты каштуе дадаткова:** у ЗША і Канаду — 40 фэнігаў (10 ам. цэнт.); у Аргентыну — 70 фэн. (17 ам. ц.); у Аўстралію — 90 фэн (22 ам. ц.). Падвойныя нумары каштуюць падвойна.

Банковае конто: Zeitung „Baćkauščyna", Konto Nr. 357-125, Bay. Hypotheken- u. Wechselbank, München.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE" | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "THE FATHERLAND"

№ 8 (394) Нядзеля, 23 лютага 1958 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 12

Да падзеяў на Сярэднім Усходзе

Арабскія краіны Сярэдняга Ўсходу яшчэ да апошняй сьветавай вайны былі ня суб'ектам, але толькі аб'ектам міжнароднай палітыкі, а іхны сувэрэнітэт у большай або меншай ступені быў абмежаваны заходняэўрапэйскімі краінамі Вялікабрытаніяй і Францыяй. Пасьля апошняе сьветавае вайны гэтыя краіны пачынаюць хутка адна за аднэй здабываць поўную дзяржаўную незалежнасьць, а іхныя эманцыпацыйныя нацыянальныя імкненьні з кажным годам становяцца што раз больш актуальнымі й разам з тым што раз больш скамплікаванымі праблемамі міжнароднай палітыкі.

Скамплікаванымі ў сувязі з тым, што гэтыя краіны, ня гледзячы на сваё поўнае дзяржаўнае ўнезалежненьне, ня перасталі быць для эўрапэйскага Захаду абыякавымі ў эканамічных і стратэгічных дачыненьнях. Прыродныя багацьці гэтых краінаў, як нафта, былі й асталіся найважнейшым жаралом гэтае сыравіны для Заходняй Эўропы, а Суэскі канал ня страціў сваей ролі як найкарацейшы шлях з Эўропы ў Індыйскі й Ціхі акіян. З прычыны сваёй культурнай, эканамічнай і тэхнічнай адсталасьці, краіны Сярэдняга Ўсходу самі не маглі эксплятаваць сваіх вялізарных прыродных багацьцяў, а, хочучы-няхочучы, мусілі заставацца ў эканамічнай залежнасьці ад заходніх вялікадзяржаваў.

Гэтыя ўзаемныя сувязі, падыктаваныя канечнымі патрэбамі абодвых бакоў, сталіся прычынамі бесьперапынных непаразуменьняў і канфліктаў паміж заходнімі дзяржавамі з аднаго боку і арабскімі краінамі — з другога. Вялікую памылку зрабіла тут спачатку Вялікабрытанія й Францыя, калёніямі якіх былі раней краіны Сярэдняга Ўсходу. Сьлепа трымаючыся свайго каляніяльнага прынцыпу, яны мала лічыліся із запраўднымі патрэбамі арабскіх народаў, ігнаравалі іхныя справядлівыя нацыянальныя імкненьні, а сваю палітыку абапіралі на перакупленых імі мясцовых каралёх і шэйках. Такі мэтад мог сябе апраўдываць толькі датуль, пакуль арабскія краіны поўнасьцяй ня ўнезалежніліся і засяляючыя іх народы не пачуліся поўнымі гаспадарамі ў сябе дома.

Калі-ж гэта наступіла, Сярэдні Ўсход стаўся тэатрам бесьперапынных канфліктаў зь Вялікабрытаніяй і Францыяй, а цераз іх, із цэлым заходнім сьветам. Арабскія народныя масы, кіруючыся фанатычным нацыяналізмам і знаходзячыся на прымітыўным узроўні культурнага разьвіцьця, прычыну сваей эканамічнай адсталасьці й цяжкага сацыяльнага палажэньня пачалі бачыць у каляніяльнай залежнасьці сваіх краінаў ад эўрапэйскага Захаду. Эканамічныя ўзаемадачыненьні, навет вельмі выгадныя для Сярэдняга Ўсходу, з эўрапэйскімі краінамі сяньня гэтыя масы ўважаюць за замаскаваную форму каляніяльнае залежнасьці.

Алівай да агню было стварэньне дзяржавы Ізраэля, якое ўсімі Арабамі разглядаецца як варожы супраць іх акт заходніх дзяржаваў. Частыя збройныя канфлікты між малым, але мадэрна ўзброеным Ізраэлям і адсталымі і ў мілітарнай галіне прымітыўнымі Эгіптам і Ярданам арабскія народы выкарыстоўваюць таксама супраць Захаду, обвінавачваючы яго ў выдатным падтрымоўваньні ізраэльскае дзяржавы.

Напасьледак, каляніяльная палітыка Францыі ў дачыненьні да арабскіх краінаў Паўночнае Афрыкі змабілізавала ўвесь арабскі сьвет ня толькі супраць Францыі, але й наагул Захаду.

Хаця заходнія дзяржавы мелі шмат клопатаў на Сярэднім Усходзе, але неяк давалі сабе раду з паасобнымі арабскімі краінамі, у выніку чаго ўзаемныя непаразуменьні й канфлікты пасьля некаторага часу заканчваліся ўсё-ж палюбоўна. Палажэньне зьмянілася, калі пару год таму на Сярэдні Ўсход пранік Савецкі Саюз і ўзяў на сябе крывадушную ролю абароньніка нацыянальных інтарэсаў арабскіх народаў перад «заходнім каляніялізмам». Мэты Савецкага Саюзу тут ясныя й навет для многіх Арабаў зразумелыя: выціснуць зь Сярэдняга Ўсходу ўплывы Захаду й заняць самому ягонае месца, а на бліжэйшую мэту — прыспорыць Захаду як найболей клопатаў на гэтым вельмі важным для яго з эканамічнага й стратэгічнага гледзішча адрэзку.

Нельга сказаць, каб арабскі музулманскі сьвет меў вялікія сымпатыі да камунізму. Навет эгіпскі дыктатар палкоўнік Нассэр, хоць і ахвотна прыймае савецкую эканамічную й мілітарную дапамогу, аднак сваіх собскіх камуністых садзіць у турмы. Але арабскія краіны выкарыстоўваюць камунізм у сваёй ігры супраць Захаду, а таксама ня грэбуюць савецкай дапамогай. Пры гэтым у арабскім сьвеце, падобна як і амаль усюды вонках межаў Савецкага Саюзу, дзякуючы ўмелай бальшавіцкай прапагандзе й поўнай адсутнасьці заходняй контрапрапаганды, злажылася памылковае й шкоднае перакананьне, што Савецкі Саюз, як і ў мінуласьці царская Расея, ня ёсьць каляніяльнай краінай і не праводзіць каляніяльнай палітыкі. У сувязі з гэтым арабскія народы не разумеюць тэй вялікай небясьпекі, якую прыгатаўляе ім камунізм і ягоны цэнтр — Савецкі Саюз.

Калі да пранікненьня на Сярэдні Ўсход Савецкага Саюзу адбывалася там ігра двух сілаў — арабскага сьвету й Захаду, дык сяньня паявілася на сцэне яшчэ й трэйцяя сіла — Савецкі Саюз. Дзякуючы гэтаму, змаганьне між гэтымі сіламі сяньня моцна завайстрылася, а ягоным беспасярэднім вынікам сталася вялікае насіленьне арабскага нацыяналізму, які ня рэдка прыймае фанатычныя хвараблівыя формы. Галоўную ролю ў вагульна арабскім руху іграе эгіпскі дыктатар палкоўнік Нассэр, які ставіць сабе канчальнай мэтай задзіночаньне ўсіх арабскіх краінаў пад эгіпскім кіраўніцтвам. Гэтая панарабская ідэя апошнім часам узыйшла на шлях канкрэтнага ажыцьцяўленьня.

Зь ініцыятывы Нассэра 1 лютага сёлета была праклямаваная Задзіночаная Арабская Рэспубліка, у склад якой увайшоў Эгіпт і Сырыя. Палкоўнік Нассэр стаўся прэзыдэнтам новае рэспублікі, а прэзыдэнт Сырыі Куватлі — ягоным заступнікам. Сталіцай новай рэспублікі будзе Каір, куды маюць перанесьціся і ўсе замежныя амбасады з Сырыі. Адначасна ў Каіры было афіцыяльна абвешчана, што і Еман маніцца прылучыцца да Задзіночанай Арабскай Рэспублікі.

Факт паўстаньня Задзіночанай Арабскай Рэспублікі ня мае сяньня свайго прэцэдэнсу ня толькі таму, што ў пэрыяд, калі ў сьвеце паўстаюць што раз новыя незалежныя дзяржавы, тут маем адваротнае зьявішча: дабравольнае зьнікненьне дзьвюх незалежных дзяржаваў, на месцы якіх паўстала адна дзяржава. Гэты факт мае сваю вымову яшчэ й таму, што Эгіпт ня мае з Сырыяй супольнай граніцы і новая дзяржава будзе тэрытарыяльна разьмежаваная тэрыторыяй Лібану, Ізраэля й Ярданіі. Калі-б прылучыўся да гэтай новай дзяржавы яшчэ Еман, які ляжыць на самым канцы Арабскага поўабтоку, дык Задзіночаная Арабская Рэспубліка тэрытарыяльна дзялілася-б на тры часьці, нязлучаныя між сабою. Таму задзіночаньне Эгіпту з Сырыяй ня было выкліканае ані эканамічнымі, ані дзяржаўнымі інтарэсамі абодвых народаў, а было выкліканае рамантычнымі матывамі — нацыяналістычнымі панарабскімі імкненьнямі.

Два тыдні пасьля абвешчаньня Задзіночанай Арабскай Рэспублікі 14 лютага сёлета была абвешчаная Арабская Фэдэрацыя, у склад якой уваходзяць Ірак і Ярданія. На чале новай фэдэрацыі стаіць кароль Іраку Фэйсаль, але і ён і кароль Ярданіі Гусэйн захоўваюць і надалей тытулы каралёў сваіх краінаў. Абедзьве краіны будуць мець супольную абаронную й замежную палітыку, а сталіцай фэдэрацыі будзе на зьмену — кажныя тры месяцы — Багдад і Амман.

Паўстае цяпер пытаньне, якое значэньне можа мець для Захаду з аднаго

(Заканчэньне на 2-ой бачыне)

Беларусы - прасьветнікі Маскоўшчыны

У мінулым годзе ў Менску была выпушчана выдавецтвам Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту брашура пад назовам «**Беларусы ў Маскве XVII ст. Зь гісторыі расейска-беларускіх сувязяў**». Брашура гэтая (60 бачынак) напісаная на расейскай мове дацэнтам катэдры гісторыі СССР Л. С. Абэцэдарскім. Яна напісана ў стылі навукова-папулярнай літаратуры на аснове выпадковых дасьледаваньняў ці паказаньняў пераважна расейскіх навукоўцаў, і зьяўляецца, такім чынам, абагульненьнем выпадковых даведак, а не самастойнай дасьледчай працай аўтара.

Ня гледзячы на ўспомнены недахоп і на тыя шматлікія «палітычныя» ськідкі ў бок «старэйшага брата», пра якія будзе гутарка ніжэй, праца Абэцэдарскага — гэта ня толькі новае зьявішча ў беларускай савецкай гістарыяграфіі, але й новы ўклад у аб'ектыўнае вывучэньне гісторыі беларускага народу.

Брашура фактычна выступае супраць прынятае канцэпцыі ў савецкай гістарыяграфіі пра тое, што на працягу свае гісторыі беларускі народ нічога свайго не стварыў, запазычаў, жыў і ўзгадоўваўся толькі на культуры расейскага народу. На фактычным матар'яле ў брашуры паказана, што культура беларускага народу навет у часе яе заняпаду, спрычыненага войнамі з Маскоўшчынай і польска-каталіцкай узрастаючай рэакцыяй (у брашуры разглядаецца другая палова XVII стагодзьдзя), стаяла куды вышэй за культуру расейскага народу. Не Беларусы вучыліся ў Расейцаў, але запрошаныя ці вывезеныя сілай у Маскву падчас вайны Маскоўшчыны з Польска-Літоўскім гаспадарствам 1654-1667 гадоў беларускія мастакі й культурныя працаўнікі навучалі Расейцаў майстэрства й пашыралі сярод іх культуру. Трэба зазначыць, што падчас гэтае вайны амаль што ўся Беларусь апынулася пад расейскім панаваньнем, а таму ў Маскве аказалася шмат Беларусаў з усіх куткоў Беларусі, асабліва зь Віленшчыны, Полаччыны, Меншчыны, Віцебшчыны і з Магілёўшчыны. Туды трапілі Беларусы, пачынаючы ад майстроў аружэйнікаў, кавалёў, разьбяроў, ганчарнікаў, скульптараў, архітэктараў і канчаючы кнігадрукарамі, сьпявакамі, тэатральнымі артыстымі, настаўнікамі сьпеваў і граматы наагул культурнымі прасьветнікамі ў поўным сэньсе гэтага слова, якім быў, прыкладам ,культурны прасьветнік Маскоўшчыны Сымон Полацкі. Яны стварылі найлепшыя архітэктурныя помнікі, залажылі пачаткі расейскай скульптуры, заснавалі грунтоўны расейскі друк, першы расейскі тэатр і палажылі пачаткі ў разьвіцьці расейскай паэзіі й драматургіі (Сымон Полацкі).

Гаворачы пра ўсё гэта, брашура фактычна пацьвярджае праўдзівасьць канцэпцыі «беларускіх буржуазных нацыяналістых» 1920-х гадоў пра «XVI залаты век у разьвіцьці беларускае культуры», якая ў свой час была выкінута з савецкай гістарыяграфіі разам зь ліквідацыяй наагул беларускай гістарыяграфіі. Аўтар стараецца папраўляць расейскіх навукоўцаў, якія зь ведамых прычынаў найчасьцей замоўчваюць пра дзейнасьць Беларусаў у Маскве. залічаючы іх да Палякоў ці проста да неазначаных «чужынцаў», а іхнае наватарства — да ўплываў заходня-эўрапэйскае культуры.

Аднак цікавы падыход аўтара брашуры да пастановы справы наагул. Прыкладам, падымаючы пытаньне, чаму беларускія навукоўцы дасюль не займаліся вывучэньнем пытаньня беларуска-расейскіх культурных сувязяў (б. 5), ён адказвае, што гэтаму ў значнай ступені перашкаджала адсутнасьць гістарычных крыніцаў. Аўтару добра ведама, што беларускім навукоўцам было забаронена займацца гэтым пытаньнем, а калі й не, дык толькі вышукваньнем «благотворных» уплываў культуры расейскага народу на культуру беларускага народу. Ды й сам аўтар брашуры няўпэўнены ў слушнасьці сваіх абавязкаў. Запраўды, ствараецца ўражаньне, што ён напісаў сваю брашуру «на заказ», ці проста напралом вырваўся з агульнаўстаноўленых рамак, а таму найхутчэй пасьпяшыўся з апраўданьнем свайго паступку, як гэта ён робіць у заключэньні, а пайменна: «Прыведзеныя вышэй дадзеныя пра дзейнасьць беларускіх перасяленцаў сталі ведамымі ня ў выніку спэцыяльных дасьледваньняў. Як ужо было адзначана, яны былі апублікованы расейскімі дасьледнікамі ў сувязі з вывучэньнем розных пытаньняў гісторыі расейскай культуры. Зусім ясна, што абмінуць гэтыя дадзеныя, ня зьбедніваючы гісторыі матар'яльнай і духовай культуры брацкіх расейскага й беларускага народаў, ніяк немагчыма. Шматбаковую дзейнасьць Беларусаў у Расейскай дзяржаве XVII ст. высака ацанілі перадусім расейскія навукоўцы...» (б. 49). Як бачым, падыход аўтара брашуры да праблемы ёсьць няпрытычным і бясспрынцыповым, залежным ад таго, «а што скажуць там у цэнтры?.

Вялікая загана брашуры — гэта намер аўтара палагодзіць непалагоджанае, г. зн. усё падагнаць пад загадзя пастаўлены выснаў. Аўтар брашуры ўвесь час трымаецца савецка-расейскае канцэпцыі пра тое, што беларускі народ праз усю сваю гісторыю толькі й імкнуўся да злучэньня з расейскім народам. У дадзеным адрэзку часу ён бачыць гэтае «імкненьне» і ў паўстаньні беларускага сялянства й мяшчанства ў 1648-1654 гадах, і ў перасяленьні дзесяткамі тысяч беларускага сялянства ў тлыбіню Расеі падчас вайны Маскоўшчыны з Рэчай Паспалітай (Польска-Літоўскім гаспадарствам) 1654-1667 гадоў, і ў прабываньні беларускіх майстроў і прасьветнікаў у Маскоўшчыне, і ў іхняй там дзейнасьці, ды наагул ува ўсякіх сувязях Беларусаў з Расейцамі.

Як проста й прымітыўна. Калі ходзіць пра сялянства, дык аўтару бра-

(Заканчэньне на 2-ой бачыне)

За мінулы тыдзень

На мінулым тыдні далей працягвалася вымена «пасланьнямі» паміж Захадам і камуністычным блёкам, ці дакладней кажучы — паміж ЗША і СССР. 17 студзеня быў апублікаваны новы адказ прэзыдэнта Айзэнгаўэра на ліст Булганіна ў справе скліканьня канфэрэнцыі на «найвышэйшым узроўні». Айзэнгаўэр закідае Булганіну, што апошні хоча паставіць на парадак дня такой канфэрэнцыі толькі такія пытаньні, абмеркаваньне й вырашэньне якіх выгаднае толькі СССР, і зусім ігнаруе праблемы, неадкладнага вырашэньня, якіх вымагае Захад. З паміж іх Айзэнгаўэр яшчэ раз падкрэсьліў неабходнасьць выкарыстаньня міжплянэтнай прасторы толькі для мірных мэтаў, кантраляванага раззбраеньня, аб'еднаньня Нямеччыны, даць магчымасьць народам Усходняй Эўропы свабодна выбіраць свой грамадзка-палітычны лад. Нажаль, у ўяўленьнях Айзэнгаўэра Ўсходняя Эўропа ў гэтым выпадку канчаецца дзесьці на граніцы СССР з 1939-га году. Далей прэзыдэнт ЗША прыдае вялікае значэньне — для справы палепшаньня ўзаемадачыненьняў паміж Захадам і Ўсходам — пашырэньню вымены ня толькі спэцыялістымі ў галіне тэхнікі, але й навуковымі, культурнымі й палітычнымі дзеячамі, і перадусім моладзяй.

У гэтай «вайне пасланьнямі» бальшавікі стараюцца ня выпусьціць із сваіх рук ініцыятывы. Адчуўшы, што сярод левых, пераважна апазыцыйных, заходняэўрапэйскіх партыяў знаходзяцца прыхільнікі «пляну Рапацкага», які прадугледжвае стварэньне «безатамнай зоны» на тэрыторыі абедзьвюх частак Нямеччыны, Польшчы й Чэхаславаччыны, і што цераз гэта збольшваюцца шансы на ягонае ажыцьцяўленьне, Крэмль афіцыйна заявіў аб сваёй падтрымцы гэтага пляну.

Зьняцьце Пушкіна й назначэньне самога Первухіна «паслом» СССР у «ДДР», выясьняецца, хіба, ня толькі апошнімі чысткамі на камуністычных вярхох савецкай зоны Нямеччыны. Трэба спадзявацца, што хутка даведаемся, якую карту рыхтуецца адкрыць Масква ў нямецкім пытаньні. Із свайго боку, урад Нямецкай Фэдэральнай Рэспублікі, бачучы, што плян Рапацкага зьяўляецца адным зь першых крокаў на шляху да савецкага пляну нэўтралізацыі цэнтральнай Эўропы й ліквідацыі НАТО, адмоўна паставіўся да польскай прапановы ўвайсьці ў «безатамную зону».

*

Францускa-туніскі канфлікт працягваецца. Ён паўстаў з прычыны збамбардаваньня францускай авіяцыяй туніскай пагранічнай вёскі, якая была апорным пунктам альжырскіх паўстанцаў. Але запраўдная прычына канфлікту хаваецца глыбей. Ён зьяўляецца вынікам змаганьня паміж Францыяй, якая імкнецца захаваць перадусім свае эканамічныя інтарэсы ў Паўночнай Афрыцы — з аднаго боку, і салідарным фронтам арабскага насельніцтва гэтага раёну, якое імкнецца да поўнай нацыянальнай незалежнасьці, — з другога.

*

Змучыўшыся выганяньнем Галяндцаў із сваёй тэрыторыі, прэзыдэнт Інданэзіі, Сукарно, выехаў заграніцу на адпачынак.

Маленькая дыгрэсія. Хутка пасьля атрыманьня незалежнасьці, адпачываючы ў Маскве, Сукарно вельмі спадабалася савецкая «дэмакратыя». Вярнуўшыся ў Джакарту, ён назваў дэмакратыю заходняга тыпу «лішнім люксусам» і, пад уплывам савецкай «дэмакратыі», абвесьціў у сябе «кіраваную дэмакратыю», гэта значыць, што над дэмакратыяй ёсьць яшчэ нейкі «супэр-дэмакрат» Сукарно, які ёй павінен абсалютна кіраваць... Зусім натуральна, што ў парлямант такой «дэмакратыі» былі адразу-ж пакліканыя камуністыя. Аднак ня ўсе ў Інданэзіі на такую «дэмакратыю» згадзіліся.

У часе апошніх гастроляў Сукарно па суседніх краінах, на абтоку Суматры стварыўся апазыцыйны ўрад, які пастанавіў ня прызнаваць цэнтральнага ўраду Сукарно да таго часу, пакуль зь яго ня будуць выключаныя камуністыя. Апазыцыйны ўрад на Суматры быў прызнаны вайсковымі аддзеламі на абтоку Цэлебэс. Інданэзіі пагражае распад і хатняя вайна.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Пад знакам палітычнага каньюнктурызму

У вапошнія часы ў сувязі з саракагадовым юбілеем Кастрычніцкай рэвалюцыі ў беларускім савецкім мастацтвазнаўстве наглядалася некаторае ажыўленьне. Праўда, сур'ёзных, салідных працаў, — як сьцьвярджае й савецкі друк — тут ня было, але сёе-тое з артыкулаў і зацемак у часапісах і газэтах паяўлялася. Нажаль, паяўленьне матарыялаў у галіне мастацтвазнаўства ня толькі ня прыносіць пачуцьця задаваленьня, але наадварот, у бальшыні выпадкаў выклікае справядлівыя абурэньні.

Беларускі савецкі навуковец пазбаўлены права свабодна, аб'ектыўна і шчыра разглядаць тое ці іншае пытаньне. Навет шырокае выкарыстаньне матарыялаў і жаролаў для яго незаўсёды магчымае .Вынікам такіх ягоных дасьледваньняў можа быць толькі тое, што адказвае ўстаноўкам партыйнага курсу ў дадзеным пытаньні. Усё гэта, з аднаго боку, скоўвае, паняволвае думку сур'ёзнага дасьледавальніка, а, з другога боку, спрычыняецца да прыходу ў крытыку людзей пустых і павярхоўных, якія дзела кар'еры гатовыя пяяць пад дудку партыйнага кіраўніцтва. З навуковых дасьледваньняў і назіраньняў пераважна лезе голая тэндэнцыя, дэмагагічная прапаганда, каньюнктура.

Гэтак стаяць справы, прыкладам, зь гісторыяй беларускай музыкі, у прыватнасьці з пытаньнем аб **першай беларускай опэры**. Калі пералістываць балонкі савецкіх жаролаў, дык трапляеш на такія адкрыцьці:

1. Малая Савецкая Энцыкляпэдыя (т. 5, 1927 г.) называе першай беларускай опэрай «Залёты» В. Дуніна-Марцінкевіча з музыкай М. Кімонт, датуе яе 1925 годам (пастаноўка адбылася ў Вільні ў межах тагачаснай Польшчы).

2. Вялікая Савецкая Энцыкляпэдыя (т. 4, 1950 г.) лічыць, што першай беларускай опэрай была «Вызваленая праца» Чуркіна, напісаная й пастаўленая ў БССР у 1922 годзе. Да апошняга часу гэтую вэрсію падтрымлівала й беларуская прафэсыянальная крытыка (артыкул Смольскага ў часапісе «Беларусь», № 5, 1950 г.).

3. Апошнія пасьлясталінскія матарыялы пачынаюць у вадзін голас запэўняць, што раней Кастрычніцкай рэвалюцыі наагул нічога ня было і першая беларуская опэра зьявілася ў 1939 годзе — гэта «Міхась Падгорны» Цікоцкага. Падобныя разыходжаньні знаходзім і ў артыкулах розных спэцыялістых у справе беларускага опэрнага мастацтва.

Вось і разьбярыся тут! Ня толькі ў незнаёмата із справаю, але і ў спэцыялістага проста галава забаліць. Галоўнае тут тое, што із запраўднай гісторыяй ніводнае з названых жаролаў ня лічыцца, замоўчвае фактычныя дадзеныя, блытае, як хаця, хроналёгію й формы мастацтва.

У сваім захапленьні перад «дабрадзействамі» кастрычніка савецкая гістарыяграфія забываецца, што беларускі народ існаваў шмат раней за яго, ад IX стагодзьдзя меў ужо сваю дзяржаўнасьць, сваю культуру й абыходзіўся без савецкае ўлады. Цікава, што крытыкі Модэль і Смольскі, робячы экскурсію ў мінуласьць, усе факты ўзьнікненьня беларускага музычнага спэктаклю ў XIX ст., назвалі толькі «спробамі», адмахнуўшыся навет ад «Сялянкі» Манюшкі на тэкст Дуніна-Марцінкевіча. Ім патрэбна было толькі выказаць ведамую сэнтэнцыю, што «толькі Вялікая кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя . . .», «толькі плённы ўплыў расейскай клясыкі . . .» і г. д.

Такім чынам за пачатак беларускай опэры вызнаецца толькі той спэктакль, які адбыўся пасьля бальшавіцкай рэвалюцыі і, да таго, быў у духу расейскай опэрнай клясыкі.

Недарэчнасьць, парадаксальнасьць і навет трагікамізм такога цьверджаньня проста відавочныя. Нам не зразумела, чаму і пры такіх умовах трэба пачынаць храналёгію беларускай опэры

(Заканчэньне на 3-яй бачыне)

Да падзеяў на Сярэднім Усходзе

(Заканчэньне зь 1-ай бачыны)

боку, а для Савецкага Саюзу — з другога, практычнае ажыцьцяўленьне панарабскай ідэі. Зразумела, што гэтае пытаньне мае свой сэнс, калі задзіночаньні арабскіх дзяржаўных арганізмаў вытрымаюць жыцьцёвую пробу. У гэтым выпадку нельга сказаць, каб задзіночаньне Эгіпту з Сырыяй і Іраку зь Ярданіяй было асабліва выгадным і для Захаду й для Савецкага Саюзу.

Як ведама, Ірак уваходзіць у склад Багдадзкага пакту, а Ярданія не. Калі ў свой час стаяла пытаньне ўваходу Ярданіі ў склад Багдадзкага пакту, дык насельніцтва гэтае краіны адказала вулічнымі дэманстрацыямі супраць належаньня да Багдадзкага пакту. Праўда, тэарэтычна Ірак мог-бы і надалей аставацца ў складзе гэтага пакту, але-ж, з другога боку, гэта пакт ня толькі палітычны, але й вайсковы, а Арабская Фэдэрацыя, г. зн. Ірак і Ярданія будуць мець супольную армію. Такім чынам справа далейшага належаньня Іраку да Багдадзкага пакту робіцца вельмі праблематычнай. Паўстаньне Задзіночанай Арабскай Рэспублікі пад кіраўніцтвам Нассэра выдатна ўзмацнівае палітычнае становішча эгіпскага дыктатара. А якраз палкоўнік Нассэр будзе мець цяпер у руках ня толькі Суэскі канал, але й нафтаправады, якімі плыве нафта зь Іраку да Міжземнага мора. Гэта таксама можа пагражаць для Захаду новымі кампліка́цыямі.

Але гэта яшчэ не абазначае, што ў вялікай ігры між Захадам і Савецкім Саюзам на Сярэднім Усходзе Саветы здабылі якуюсь перавагу. Як ведама, у Эгіпце камуністычная партыя забароненая, а ейныя былыя сябры сядзяць у турмах. Яшчэ ня так даўно выпадкі паказвалі, што Сырыя можа стацца савецкім сатэлітам, а ейная камуністычная партыя зьяўляецца даволі сільнай. Цяпер-жа Нассэр можа з сырыйскімі камуністымі зрабіць тое самае, што зрабіў і з камуністымі эгіпскімі. Ды і сам факт узмацненьня нацыяналістычных настрояў у арабскім сьвеце, якія ў сваім ідэялягічным прынцыпе зьяўляюцца антыкамуністычнымі, ня можа быць на руку Савецкаму Саюзу.

Не падлягае сумлеву факт, што апошнія падзеі на Сярэднім Усходзе адкрываюць новыя магчымасьці й пэрспэктывы для заходняй палітыкі. Таму з боку заходніх дзяржаваў сяньня патрэбен асаблівы такт і гібкасьць у дачыненьні арабскіх краінаў. І вось якраз у гэткі важны й адказны мамэнт Францыя зрабіла вельмі неразважны крок, які ня можа спрычыніцца да ўнармаваньня дачыненьняў між Захадам і арабскімі краінамі.

Гэтым неразважным крокам было збамбардаваньне францускім лётніцтвам туніскай вёскі Сакет. Збамбардаваньне быццам было выклікана тым, што ў гэтай вёсцы мелі для сябе прытулак альжырскія паўстанцы, якія абстрэльвалі францускія самалёты. Факт аднак застаецца фактам, што ў выніку бамбардаваньня было забітых 72 цывільных асоб, у тым 9 жанчын і 12 дзяцей, а 87 асоб было раненых. Гэты факт нязвычайна ўзмоцніў варожасьць Арабаў ня толькі ў дачыненьні да Францыі, але й усяго Захаду, а таксама выклікаў абурэньне ў вольным сьвеце, між іншым і ў самой Францыі, асабліва сярод сацыялістых. У сувязі з гэтым француская газэта «Ле Монд» пісала, што рэдка спатыкаецца такая адназгоднасьць у сьветавай прэсе, як у справе бамбардаваньня Сакет. «Жалюгодным ёсьць толькі тое, што гэтая адназгоднасьць была дасягнутая для абвінавачаньня, а яшчэ больш балючым ёсьць тое, што абвінавачаная была якраз Францыя» — пісала гэтая газэта.

Урад Тунісу ў вадказ на бамбардаваньня быў заблякаваў францускія вайсковыя гарнізоны, што згодна із спэцыяльнымі дагаворамі знаходзяцца на тэрыторыі Тунісу, зрабіў першыя крокі да зрыву дыпляматычных дачыненьняў з Францыяй і справу ськіраваў у Раду Бясьпечнасьці. Праўда, апошнім часам пры выдатным пасярэдніцтве Амэрыкі між Францыяй і Тунісам наступіла значнае адпружаньне, тым ня меней гэты выпадак пакінуў густы цень на гарызоньце француска-арабскіх дачыненьняў.

Яшчэ раз паўтараем, што новыя падзеі на Сярэднім Усходзе адкрываюць новыя магчымасьці й пэрспэктывы для заходняй палітыкі. Гэта вельмі добра разумее Амэрыка й чула рэагуе на сярэдняўсходнія выпадкі. Але ўдача амэрыканскай палітыкі будзе ў вялікай меры залежыць ад таго, ці і ў якой меры падтрымаюць яе заходнія дзяржавы. Палітыка Вялікабрытаніі што раз болей зблiжаецца з палітыкай амэрыканскай, і тут няма асаблівых прычынаў для страху. Справу камплікуе затое палітыка Францыі. Калі ўсё-ж такі ўдасца Амэрыцы пераканаць Францыю аб канечнасьці поўнага ўнармаваньня дачыненьняў з арабскімі краінамі Паўночнай Афрыкі, дык ёсьць усе дадзеныя, што ў розыгрышы між Саветамі і Захадам за ўплывы на Сярэднім Усходзе выйграе Захад.

Язэп Каранеўскі

Беларусы - прасьветнікі Маскоўшчыны

(Заканчэньне зь 1-ай бач.)

шуры павінна быць ведама, што паўстаньні сялянства ніколі ня былі зьвязаныя з пытаньнем перамены нацыянальнага аблічча гаспадарства, калі гэтае гаспадарства знаходзілася ў руках таго-ж самага нацыянальнага ўраду. Тым больш, што тут справа ідзе пра XVII стагодзьдзе, калі яшчэ нацыянальнае пытаньне не стаяла так войстра на парадку дня. У Маскоўшчыне таксама было шмат сялянскіх паўстаньняў, але аўтар брашуры ня скажа, што расейскае сялянства імкнулася гэтым самым «здрадзіць свайму народу» і перайсьці, скажам, на бок Літвы, праўдзівей перамяніць расейскую народнасьць на літоўскую. Ён скажа, што расейскае сялянства змагалася за палепшаньне свайго сацыяльна-эканамічнага становішча. Таксама было шмат уцёкаў расейскага сялянства на Дон ці ў межы Літвы, але ці былі гэтыя ўцёкі нацыянальна-палітычнай эміграцыяй, шуканьнем нацыянальна роднага сабе народу? Гэтыя ўцёкі былі спрычыненыя сацыяльна-эканамічнымі фактарамі. Гэтым-жа самым трэба характарызаваць паўстаньні й уцёкі беларускага сялянства. У паўстаньні 1648-1654 гадоў беларускае сялянства й мяшчанства змагалася перш за ўсё за сацыяльна-эканамічныя правы ды супраць наступу польскага рэакцыйнага каталіцызму. Разьвіваючыся пад узьдзеяньнем вызвольнага руху Багдана Хмяльніцкага на Ўкраіне й дырыгаваныя ў бальшыні выпадкаў вольным казацтвам, яны часта прыймалі антыпольскі характар, але гэта нічога ня значыць, што беларускае сялянства абавязкова павінна было быць прарасейскім, змагацца за «соединение» із сваім «старэйшым братам». Праўда, яно сымпатызавала часамі Расейцам, але толькі як крыклівым «абаронцам» праваслаўя. Свае-ж уцёкі яно ськіроўвала на поўдзень, у Запарожжа, і толькі ў надзвычайных выпадках у межы Маскоўшчыны. Таксама ў ніякім выпадку ня можна азначаць «імкненьнем беларускага народу да злучэньня з расейскім народам» масавае перасяленьне беларускага сялянства ў глыбіню Расеі, якое адбылося на загад Масквы падчас вайны Маскоўшчыны з Польска-Літоўскім гаспадарствам 1654-1667 гадоў.

Аднак аўтар брашуры найбольш мыляецца, бачучы гэтае «спрадвечнае імкненьне» беларускага народу да злучэньня з расейскім народам у масавым наплыве беларускіх майстроў і прасьветнікаў у Маскву, тым больш, калі ён сам сьцьвярджае, што большасьць гэтых майстроў і прасьветнікаў трапілі туды або ў парадку прымусовага высяленьня, або па запросінах і кантракту. Нам думаецца, што яны трапілі ў Маскву перш за ўсё ў парадку масавага высяленьня, бо ні перад гэтай вайной і расейскай акупацыяй, ні пасьля яе ніколі там ня згрупоўвалася такой паважнай колькасьці беларускіх майстроў розных галінаў, артыстых і прасьветнікаў. Прымусовасьць не азначае дабравольнасьці, а запросіны — абавязковае прыхільнасьці. Ды наагул, што мае супольнага праца майстры, артыстага й прасьветніка з імкненьнем нейкага народу «соединиться» зь нейкім народам. Калі-б гэтак ставілася пытаньне, дык на працягу XV, XVI і XVII стагодзьдзяў Італьянцы былі-б адначасна й Французамі, і Ангельцамі, і Немцамі, і Палякамі, і Беларусамі ды навет і «тымі-ж самымі» Расейцамі.

Яшчэ адна заўвага: Абэцэдарскі ў сваёй брашуры часта паслугоўваецца падобнай фразай: «майстэрства беларускіх майстроў узбагачвалася й удасканальвалася дзякуючы «благородному» ўплыву расейскага народнага мастацтва». Скуль гэта аўтар ўзяў, калі ён сам неаднаразова сьцьвярджае, што беларускія майстры занесьлі ў Маскву штосьці арыгінальнае й дасканалае, чаго яшчэ там ня было й што хутка было перанятае. Якім чынам майстэрства беларускіх майстроў магло ўдасканальвацца пад уплывам расейскага народнага мастацтва?

Наагул-жа брашура пажаданая й заслугоўвае ўвагі. Паболыш-бы іх такіх пісалася й выдавалася. Чытач не такі дурны, як думаюць часамі некаторыя аўтары. Ён сумее прасеяць збажыну, аддзяляючы чыстае зерня ад пустазельля, гістарычныя факты ад прыпісаных выснаваў.

П. Залужны

Творы Максіма Багдановіча

21)

* * *

У мясьцечку Церасьцечку не званы гудзяць,
Не званы гудзяць — навіну чуваць,
Што знайшлі сяньня Янку стральца
У зялёненькім ельнічку,
Каля белага каменю,
На цёмным імху між брусьніцаю.
Галава ў яго прабітая,
Ўся крывёю залітая.
Гэй, сасонка над ім шуміць,
Прамаўляе, выгаворавае:
«Не ўдаваўся-ж бы ты, Яне, за куніцамі,
Яшчэ болей — за тымі маладзіцамі».

* * *

Ой, грымі, труба ўранку рана,
У паход каб зьбірацца.
Пазьбіраліся таварышы Яна —
А яму не падацца.
Пазьбіраліся таварышы Яна —
У полі яму капаюць.
У тэй яме пры дарозе
Хлопца пахаваюць.
Ой, ня плач, ня плач, жонка, зь дзеткамі малымі,
Ня плач, ня нудзіся, —
Ды за Янку-небарачка
Богу памаліся.
Ён знайшоў другую жонку,
Чужую старонку, —
Ў чыстым полі зь ёй пабраўся,
Куляй заручаўся.

* * *

Цёмнай ночы лучына дагарала,
Я Арцёму кашулю вышывала:
Пасярэдзіне — сонейка,
Навокал зоры дробныя.
Толькі ўходзіць у хату сястрычанька, —
Белы-чысты ліст у руках,
Белы тварык увесь у сьлязах:
«Ой, забілі Арцёма, забілі,
У нязнанай старонцы зарылі;
Ой, забілі Арцёма шрапнэляй,
Завіруха яго крые белай беляй».
Як пачула я тое ды ўцяміла,
Мае ніткі неяк памяшаліся,
Сонца яркае скацілася, —
У вачох памуцілася,
Чаму я на сьвет урадзілася?

* * *

Як Базыль у паходзе канаў,
Ўсё старонку сваю спамінаў.
— Вы бывайце, бывайце, шнуры,
Вы бывайце, негараныя!
Мне вас болей ужо не гараць,
Буйным збожжам на зары не засяваць.
— Не пабачу я цябе, цёмны луг,
Поле чыстае, раздольнае!
Мне па вас ужо ніколі не хадзіць,
Мне зялёнай травы не касіць.
— Расстаюся я з табой, шчыры бор,
Пушча цёмная, дрымучая!
Мне твой шум ужо болей ня чуваць,
Мне высокіх сасон ня рубаць.
— Ах, бывай ты, сямейка мая,
Вы бывайце, таварышы!
Ўжо ня прыдзецца да сэрца туліць,
Пасядзець, пажартаваць, пагаманіць.
— Гэй, чалом табе, чалом, Беларусь,
Уся староначка бяздольная!
Не забыў твой сын свае маці,
За цябе у зямлі яму ляжаці.
Як Базыль у паходзе канаў,
Ўсё старонку сваю спамінаў.

МУШКА-ЗЕЛЯНУШКА Й КАМАРЫК — НАСАТЫ ТВАРЫК

(Вельмі жаласная гісторыя, выкладзеная згодна з праўдай беларускім вершам)

Блізка рэчкі Самацечкі камары таўкуцца,
І «таўкачыкі» сьпяваюць і у скокі тнуцца:
«Гэй, гоп, таўкачыкі,
Гэй, гоп, асінавы,
Ды работы Максімавы . . .»
А Максім ляжыць на траўцы, сонна пазірае,
Камарок за камарочкам да яго шыбае,
І пясьняр з усіх найлепшы ўжо зьвініць ля вуха,
Як камарыка няўмысна загубіла муха.

I

Захісталася сасонка баравая,
Затужыла дзяўчынанька маладая,
Жартаўлівая пяюшка-сакатушка,
А на ймя — дык мушка-зелянушка:
— «Ой, чаму-ж ды ня судзілася мне долі.
Што мяне і ня сваталі ніколі.
А пасагу прабагатага я маю:
Куст шыпшыны ад краю і да краю,
Шчэлка ў яблыні — пры ветры каб хавацца,
Ліст альховы — на ночку пакрывацца,
Ды да краю поўны мёдам кацялішча
З жалудовай вялізнай скарлупішчы.
Калі гэты мёд у місачку кладзецца,
Ажна сьліна ў роце набярэцца».
Як пачуў тыя жаласьці камарык —
Паскрабаў і насочак ён і тварык:
«А чаму-ж-бы мне ды зь ёй не пажаніцца?
Пэўна, пойдзе, каб болей ня журыцца.
Хоць насаценькі я, шэры, хударлявы,
Дык у скоках затое-ж як рухавы . . .»
І схапіўся камарочак прыбірацца,
Каб ля мушкі-пяюшкі увіхацца.

II

Прыляцела мушка да хаты, —
Аж у яе камарык насаты.
Сватоўе-хрушчы усьсядаюць,

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Пад знакам палітычнага каньюнктурызму

(Заканчэньне з 2-ой бачыны)

толькі з 1939 году, калі да гэтага часу і ў БССР былі або музычныя спэктаклі, або былі напісаныя опэрныя творы.

Гэтак з савецкага беларускага музыказнаўства зусім выпаў вялікага гістарычнага й прынцыповага значэньня музычны спэктакль «Купальле» з музыкай У. Тэраўскага і тэкстам М. Чарота, які адбыўся ў 1921 годзе. Аб ім і цяпер падчас рэгабілітацыі М. Чарота яшчэ баяцца гаварыць у поўны голас. Калі не на творчасьці Чарота, дык на творчасьці Тэраўскага табу застаецца яшчэ ў поўнай сіле, а разам з гэтым і «Купальле» яшчэ вісіць забароненым плодам. А якраз тут, у гэтым творы і зьмяшчаецца правільны адказ на «пяршынец беларускай опэры» новага часу, як у ідэйна-мастацкім, гэтак і ў эстэтычным характары нацыянальнага музычнага кірунку.

Партыйнаму савецкаму кіраўніцтву ня дзеля гісторыі, але з мэтаю сваёй прапаганды патрэбна было вычыркнуць зь беларускай культуры заслужанае й паважанае імя Тэраўскага, агульнапрызнанага заснавальніка беларускага нацыянальнага музычнага спэктаклю. Гэтым партыйным кіраўніцтвам нацэльваюцца цяпер музыкаведы на ачарненьне ідэйна-творчых прынцыпаў Тэраўскага, ужо ходзяць нябыліцы аб ягоным лёзунгу: «назад да жалейкі!», аб тым, што Тэраўскім да чаротаўскага «Купальля» была напісаная толькі музыка, што «Купальле» гэта навет і ня опэра.

Хіба-ж нам ня ведама, што опэрная форма ня была аднолькавай і ўніфікаванай ды ня мела свайго эвалюцыйнага разьвіцьця? Чаргаваньне музычных нумароў і дыялёгаў зусім не парушае прынцыпу музычнага спэктаклю, адно дае яму толькі іншую форму.

Ня трэба далёка забірацца ў гісторыю, каб прывесьці прыклады ўсіх ведамых украінскіх опэраў — «Запарожца за Дунаем» Гулака-Артэмоўскага, «Наталкі-Палтаўкі» Лысенкі, пабудаваных таксама на гэтым пераплятаньні музыкі й слоўнага матарыялу. У Нямеччыне існаваў ведамы «Зінгшпіль» — такая-ж самая мяшаная форма музычнага спэктаклю, як асобны від опэры. Дык няма анічога ганебнага ў тым, што першы беларускі музычны спэктакль выглядаў у форме зінгшпілю. Папершае, гэта не пярэчыць эвалюцыі опэры ў яе гістарычным пляне, падругое, яе абсалютна не забавязвае цьверджаньне савецкіх тэарэтыкаў, што яна мусіць быць пабудаваная паводля правілаў расейскай опэрнай клясыкі.

Цікава тут адцеміць, што народы СССР і да гэтага часу, ня гледзячы на настойлівыя дамаганьні цэнтру, упарта абараняюць свой собскі прынцып будаваньня музычнага спэктаклю. Савецкаму музыказнаўству тут трэба не абурацца на «безкультурнасьць» нацыяналаў, а сур'ёзна й глыбока вывучаць гэтую «нацыянальную ўпартасьць». Ня трэба забавацца і аб тым, што сярод народаў СССР ёсьць такія, культура якіх значна вышэйшая й старадаўнейшая за расейскую, з аднаго боку, і мае зусім іншы калярыт і кірунак, з другога боку. Тут падыход мусіў-бы быць запраўды навуковы й далёкі ад практыкі адміністрацыйнага прымусу.

Тэраўскі якраз быў адным з такіх упорыстых і прынцыповых людзей, якія шукалі сваёй собскай дарогі. Дзіўна, што такімі-ж зінгшпілямі, як «Купальле» Тэраўскага ,ёсьць і «Сялянка» Манюшкі і «Залёты» Кімонт, аднак гэтыя апошнія і савецкімі навукоўцамі называюцца опэрамі. Таму справа тут ня ў форме музычнага спэктаклю, але вылучна ў васобе самога Тэраўскага.

Калі-б хадзіла так моцна аб эўрапэйскай опэрнай форме музычнага спэктаклю, дык у гісторыі беларускай музыкі мы маем твор, які поўнасьцяй адказвае такой форме опэры — гэта аднаактовая опэра Аладава «Тарас на Парнасе», напісаная ў 1927 г. Чаму тады яе ня выстаўляюць савецкія музыкаведы, як «пяршынца» беларускай опэры? Дарэчы сказаць, што «Тарас на Парнасе» вельмі цікавая і з гледзішча музычнага вынаходлівая рэч. З гледзішча прафэсіянальнага яна магла-б сьмела стаяць у радзе беларускіх опэрных піянэраў, аднак успаміны аб творы Аладава ў савецкім друку вельмі скупыя й асьцярожныя. У матарыялах да юбілею (ані ў артыкуле Цікоцкага, ані Лукаса) аб ім навет і гутаркі ня было. І гэты ўзапраўды беларускі нацыянальны і ў поўнай меры сучасны опэрны твор выкінуты зь ліку гістарычных дасягненьняў.

Тлумачыцца гэта тым, што на Аладаве і дагэтуль ляжыць пляма нацдэма і яму савецкая ўлада ня можа даверыць вядучай ролі, тым больш ролі заснавальніка опэрнага мастацтва. Мастацтва мастацтвам, а палітыка палітыкай!

Гэтак вычыркнуўшы зь гісторыі наагул «Купальле» Тэраўскага і замаўчаўшы аб «Тарасе на Парнасе» Аладава, партыйнае кіраўніцтва прымусіла беларускіх крытыкаў узьвесьці да ролі заснавальніка беларускай опэры перастарэлага й вельмі абмежаванага музыку-кампазытара Чуркіна, успомніўшы, што ён у 1922 г. пісаў опэру «Вызваленая праца». Гэтая нечаканая мэтамарфоза адбылася на вачох сучасьнікаў, якія добра ведалі, што ў творы Чуркіна няма аніводнай беларускай мэлёдыі, што гэта «жывагазэтная араторыя», форма эстраднай агіткі часоў ваеннага камунізму, што аніякай опэры тут няма і што твор гэты, навет, не закончаны. Толькі ў савецкіх умовах магчымая такая містыфікацыя й такі зьдзек над гісторыяй культуры. Гэтак некалькі гадоў першае месца трымалася за Чуркінам, пакуль, ня ведама зь якіх прычынаў, аб ягонай ролі пачалі гаварыць усё цішэй, каб ужо перад юбілеем перадаць «пяршынец» кампазытару Цікоцкаму.

Аднак і апошні факт ня выглядае так як яго малююць беларускія савецкія музыкаведы Падчас падрыхтоўкі да першае дэкады беларускага мастацтва ў Маскве ў першую чаргу плянавалася паказаць опэру «Кветка шчасьця» Туранкова, які й атрымаў урадавае даручэньне. Опэры Цікоцкага й Багатырова ў пляне паявіліся значна пазьней. Зацяжка з «Кветкай шчасьця» з прычыны маруднай пераапрацоўкі лібрэта (Броўкі й Глебкі), праўда, трохі адсунула гэтую опэру, аднак у 1939-40 гадох яна і ў Менску і ў Маскве паказвалася разам з опэрамі Цікоцкага й Багатырова, а маральная перавага, асабліва з гледзішча нацыянальнага была на баку Туранкова.

Якраз Туранкоў будаваў сваю «Кветку шчасьця» паводля беларускіх традыцыяў, шмат у чым працягваў лінію Манюшкі-Тэраўскага. Цікоцкі, хоць і шырока выкарыстоўваў беларускі фальклёр, але ўвасабляў яго палкам згодна з традыцыяй расейскай клясычнай опэры, а Багатыроў навет аніводнай беларускай мэлёдыі ў сваю опэру ня ўвёў.

Што-ж бачым мы ў сучасных савецкіх беларускіх крытычных жаролах? Юбілейныя артыкулы ў «Літаратуры і Мастацтве» й «Зьвязьдзе» аб «Кветцы шчасьця» Туранкова навет не ўспамінаюць, акцэнтуючы толькі опэры Чуркіна «Міхась Падгорны», як першую беларускую опэру, а за ёй «у пушчах Палесься». Прозьвішча Туранкова, праўда, і некаторыя ягоныя творы ўспамінаюцца ў тэкстах юбілейных справаздачаў, але тую вядучую ролю, якую ён згуляў у 30-ых гадох, ён цяпер згубіў, уступіўшы месца Цікоцкаму.

Чаму гэтак сталася? Адказ просты й ясны. Туранкоў працаваў у менскім беларускім тэатры падчас нямецкай акупацыі, пасьля прыходу бальшавікоў быў арыштаваны й высланы. Пасьля дванаццацёх год катаргі ён быў рэгабілітаваны ці амнэставаны. І таму тым, чым Туранкоў быў калісьці, ён цяпер ня будзе. Як і Аладаў, ён вядучага тэатральнага становішча ніколі ўжо ня зойме. Ён можа мець і пэўны посьпех, ягоныя творы могуць выконваць, але вядучыя месцы даручаюцца ў Саветах ня людзям запраўды заслужаным і здольным, але праверaным партыяй. Хай яны будуць і слабымі, эпігонамі. — гэта ня важна. Гэткімі ёсьць савецкая гісторыя, навука, мастацтва, увесь штодзённы быт.

М. Куліковіч

Зь мінулага нашай Бацькаўшчыны

1848 год у Беларусі

Рэвалюцыя 1848 году, або, як часамі прынята называць яе «Вясна народаў», была ўскалыхнула цэлы шэраг дзяржаваў Цэнтральнае й Заходняе Эўропы. Зь ніжэй зьмешчанай гістарычнай даведкі **В. Чапко,** перадрукаванай зь менскага часапісу «Беларусь» (№ 1, 1958 г.), мы бачым, як рэха гэтай рэвалюцыі адбілася й на нашай Бацькаўшчыне.

✶

Да гэтага часу ў літаратуры яшчэ ня высьветлена пытаньне аб тым, як сустрэў рэвалюцыю 1848 году беларускі народ.

Выяўленыя нядаўна ў архівах Вільні, Горадні, Масквы й Ленінграду новыя, раней няведамыя матар'ялы дазваляюць уявіць яшчэ адну старонку зь гісторыі палітычнай барацьбы працоўных масаў Беларусі. Як сьветчаць дакуманты, рэвалюцыя выклікала тут паважныя падзеі. 1848 год у Беларусі быў бурным, трывожным для самадзяржаўя годам.

Беларусь, паводля дадзеных III аддзелу, была раёнам «довольно сильного брожения умов». У сакавіку 1848 году Польшча, Беларусь, правабярэжная Украіна былі абвешчаны на ваенным становішчы; сюды былі пасланыя вялікія сілы.

Генэрал-губэрнатарам заходніх губэрняў былі дадзены царом асобыя правы і паўнамоцтвы «прыймаць для аховы грамадзкай бясьпекі ўсе захады, якія мясцовымі акалічнасьцямі ўказаны будуць, ня просячы на тое асобага дазволу, але дзейнічаючы хутка й наважана».

З трывогай даносіў віленскі генэрал-губэрнатар ваеннаму міністру Чарнышову, што весткі аб падзеях у Эўропе хутка распаўсюджваюцца ў прыгранічных паветах Беларусі і, як адзначалася ў данясеньні, «ні ў вадной клясе жыхароў падзеі не рабілі такога ўражаньня, якоеб адпавядала пачуцьцю вернападданіцкай адданасьці. Сяляне перакананыя, што настаў рашучы час вызваленьня іх з прыгоннага становішча ... і — гатовы ўзяць гэты жахлівы прыклад».

Зь вясны 1848 году ў Беларусі пачаўся вялікі сялянскі рух, накіраваны супраць прыгоньніцтва. Асабліва вострым было становішча ў Горадзенскай губэрні. Ужо ў пачатку красавіка горадзенскі губэрнатар паведамляў віленскаму генэрал-губэрнатару, што сярод сялян Горадзенскага й Берасьцейскага павету «хадзілі чуткі пра замежныя падзеі», што тутэйшыя мужыкі «набіты вольным духам» і што шматлікія зь іх мараць аб тым, каб «іх дзеці сталі панамі».

Вясной 1848 году ў III аддзел паступіла данясеньне аб падрыхтоўцы масавага выступу сялян у Віцебскай губэрні. Шэф корпусу жандараў — граф Арлоў у дакладзе цару паведамляў аб арышце ў Пецярбурзе чатырох маладых дваранаў, ураджэнцаў Беларусі, якія вучыліся ў інжынерным вучылішчы, — братоў Антановічаў, Ратоўта й Ружыцкага. Яны абвінавачваліся ў падрыхтоўцы паўстаньня ў Беларусі. У данясеньні гаварылася, што арыштаваныя, разважаючы пра палітычныя перавароты ў Эўропе, прымервалі іх да заходніх губэрняў, мяркуючы, што і там неўзабаве пачнуцца выступы супраць улады. Яны разьлічвалі ўзьняць сялян Віцебскай губэрні.

Асабліва непакоілі ўрад падзеі ў Горадзенскай губэрні. У красавіку ў Ашмянах на сьценах дамоў былі расклеены лістоўкі, у якіх гаварылася аб рэвалюцыйных падзеях у Заходняй Эўропе. У вадказ на выпушчаны Мікалаем I маніфэст, у якім цар заяўляў, што рэвалюцыя ня зьнішчыць манархічны лад у Расеі, лістоўка пісала: «Хоць Мікалай Раманаў аб'явіў у маніфэсьце «да будет не так», але будзе так і павінна быць так!»

У Горадні й Берасьці становішча было напружанае. Жандарскі палкоўнік з Горадні прасіў накіраваць у горад вялікі вайсковы аддзел. У Берасьці хадзілі чуткі, што неўзабаве туды прыбудуць узброеныя паўстанцы для захопу вайсковай маёмасьці й для арганізацыі паўстаньня.

Віленскі губэрнатар у сваім лісьце да горадзенскага губэрнатара адзначыў, што ў Беларусі «шмат людзей, гатовых да паўстаньня, але з прычыны срогіх захадаў, якія прымаюцца нашым урадам, спробы ўзьняць зброю будуць не раней, як у той ужо час, калі ўспыхне мяцеж у Галіцыі й Пазнані».

У 1848 годзе адбыліся хваляваньні сярод школьнай моладзі Менску. Школьная рада выкінула зь гімназіі двух вучняў, у якіх была знойдзена забароненая літаратура. Пасьля сьледзтва два вучні былі накіраваныя ў ссылку й больш за 60 чалавек пакарана розгамі. На экзэкуцыі прысутнічаў губэрнатар і прадстаўнікі мясцовай улады. Каралі вучняў салдаты менскага гарнізону. Тутжа былі выстраены вучні малодшых клясаў, для якіх экзэкуцыя павінна была быць «павучаньнем». Пасьля экзэкуцыі ў гімназію прыйшоў архірэй, каб сказаць «павучальную» прамову, але гэта яму не ўдалося зрабіць — у вокны паляцелі камяні. Неўзабаве пасьля гэтага зь гімназіі зьнік партрэт цара, які знайшлі потым за горадам запэцканы й падраны на кавалкі.

У 1848 годзе ў Менску было раскрыта «зламыснае таварыства», мэтай якога, як паказвае матар'ял сьледзтва, была арганізацыя змовы для таго, каб «учыніць разьню салдатам, якія кватаравалі там, і ськінуць урад».

Нягледзячы на рэпрэсіі, становішча ў Беларусі, асабліва ў Горадзенскай губэрні, выклікала трывогу ў царскім ура-

(Заканчэньне на 4-ай бачыне)

З бацькам-маткай штось размаўляюць:
«Мы — стральцы, шукаем куніцу,
Ня куніцу, але дзявіцу».
Гаманілі больш за гадзіны
Ды гавораць так да дзяўчыны:
— «Ці да смаку наш госьць багаты?»
— «Папытайце ў мамы і ў таты».
Тут гарэлкай усё змацавалі,
А пасьля і заручын даждалі.
Браў жаніх ад мушкі-дзяўчыны
Дарагі ручнік з павучыны,
Што яна на траўцы сьцяліла
І на ясным сонцы бяліла.
У нядзелю будзе вясельле,
Захадзіў камар, як з пахмельля, —
І пяе, і скача паціху.
Ды як сыпне ўраз «шырсьцяніху»:
«Шырсьцяніха, шырсьцяніха мая,
Пакахала камара гультая.
А камар не зважае на яе,
Толькі лётае ды песьні пяе».

III

Загудзела, расшумелася дубрава:
Аб вясельлі у дубраве стала слава.
Як вянок на муху свацейкі надзелі,
Ўсе навокала аж вочы праглядзелі.
А калі бацьком журылася дзяўчына,
Аж заплакала жаноцкая радзіна:
«Ускланяюся татачцы і матачцы,
Калі ўжо апрыкрыла ім у хатачцы.
І чаму-ж вы мяне гадавалі
Ды ў чужую сямейку аддалі?»
Ў каравайніцы сьлімачак запрасілі,
І яны дзяжу напродзіў замясілі.
Авадзень быў камаровым старшым дружкам,
Рассыпаўся дробным макам перад мушкай.
Матылькі — баяры, пчолачкі — баяркі —
Спрытны, шпаркі, асабліва як да чаркі.
А найстаршая баярачка-чмяліха
Так сьпявала, аж баяр пабрала ліха:
«Ой, багаты баяры, багаты,
Ды забыліся ўзяць грашаняты.
Хоць ня шмат грашанят яны маюць,
Дык затое свой гонар трымаюць:
Хто капейку дае — грыўняй ліча яе,
А хто грыўню паклаў — што рубля дараваў».
А як сыпнулі-урэзалі музыкі,
Дык узьняўся разам гоман там вялікі.
Чмель пузаты на басолі гучна грае,
А на йскрыпцы ёмка пчолка падсякае.
І знайшоўся мушанётак нейкі малы,
Што званіў такі някепска у цымбалы.
Лоўка конікі у скоках выціналі,
У гару стрыбалі, звонка падпявалі:
«Камары скакаць
Выракаюцца:
Ногі доўгія —
Паламаюцца».
Гэтак скачуць — хто патроху, хто памногу.
Нейкі конік адтаптаў чмялісе ногу.
Госьці спорна п'юць-ядуць ды размаўляюць.
А музыкі граюць, дыхту заўдаваюць.
Умела муха на вясельле запрашаці,
Ды над тое лепш умела частаваці.
Усяго стаяла досыць для гасьціны:
Навет мёд быў і чмяліны і пчаліны.
Хрушч вялізны так гарэлкі насмактаўся,
Што зваліўся ды ў куточку высыпаўся,
Восы ў шатах чорных з жоўтымі стракамі
Проста елі мушку злоснымі вачамі.
А яна ля мужа сьціпленька сядзела
І зялёненькай спаднічкай зігацела.
Мураўёўна нізка зьвесіла галоўку,
Бо занадта зацягнулася ў шнуроўку.
Ды як скрыкнула, як ахнула рантоўна:
У кроплі дожджыка танула мураўёўна.
Ўсё сьцямнела, кроплі шпарка застукалі,
У дупло, дзе мушка жыла, пападалі.
Пахаваліся ўсе госьці у куточкі:
Так спынілася вясельле сярод ночкі.
А назаўтра ўсе, як толькі ўсталі зраньня,
Дык пайшлі да камара на баляваньне.
І былі яшчэ нарэшце перазовы,
Каб ня стала аб радзіме кепскай мовы.

IV

Абляцелі кветачкі
Не ў пару.
Невясёла шэраму
Камару.
Як пачаў ён параю
З мушкай жыць —
Давялося беднаму
Патужыць.
Ня умее мушачка
Працаваць,
Толькі ўмее з хлопцамі
Жартаваць;
Ані выткаць кросенак,
Ані шыць,
Ані стравы хораша
Наварыць.
Пачухаў камарычак
Галаву:
«Як я з гэтай жонкаю
Пражыву?
Дзе я вочы, брацікі,
Меў свае,
Як сабе за жоначку
Браў яе?»
Паляцеў ён плакацца
У лясок,
Сеў на дуб зялёненькі
Пад лісток.
Пахіліў галовачку,
Уздыхнуў,
Песьню сумна, жудасна
Зацягнуў:
«Выйду ў поле ды разважу тое гора,
Гэй, гаротнае, маркотнае!
Ты шырока, маё полейка,
Ад кусточка да кусточка разьлягаешся,
Ты глыбока, сэрца, краешся.
Дзе цяпер я сьмерць сваю спаткаю:
Ці у моры, ці у рэчцы, ці ў ставочку,
Што капытам пры дарозе быў прабіты
І да краю дожджыкам наліты?
(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Зь беларускага жыцьця

Расьце Беларуская Каса Самапомачы ў Таронта

9-га лютага сёлета ў Беларускім Доме ў Таронта адбыўся V-ты гадавы сход Беларускай Касы Самапомачы пры Згуртаваньні Беларусаў Канады. Кіраваў працаю сходу старшыня Дырэкцыі Касы сп-р мг-р Грыцук, сакратараваў сп-р Чорны.

У 1957 годзе Каса добра разьвівалася. Выдана было 17 пазыкаў на агульную суму 16 170 дал. 35 ц. і ўложана сябрамі Касы ашчаднасьцяў на суму 20 679 дал. 94 ц. Найбольшая пазыка была на суму 3 000 дал. і найменшая — 50 дал.

На ўложаныя ашчаднасьці было выплачана па 3,5%, а на сяброўскія ўдзелы па 5%. Гадавы даход з працэнтаў быў 1 405 дал. 40 ц. У Касу прыбыло ў мінулым годзе 10 новых сяброў.

Усе грошы, уложаныя ў Касу, цяпер забясьпечаныя. На пакрыцьцё забясьпечаньня было выдана ў мінулым годзе 97 дал. 11 ц. Калі-б прыкладам, хто-небудзь, пазычыўшы грошы, ня мог іх сплаціць у Касу, то кампанія забясьпечаньня мае пакрыць страты. Такім чынам ашчаджаючыя маюць усе пэўнасьці, што іхны капітал не прападзе.

Калі параўнаць працэнт выплачаны Касай на ашчаднасьці й удзелы з працэнтам, выплачаным мясцовымі банкамі, то сябры Беларускай Касы Самапомачы добра скарысталі, ашчаджаючы ў сваёй Касе.

Агульны гадавы абарот капіталу ў Касе быў 110 231 дал. 41 ц. — амаль на дзесяць тысяч вышэй чымся ў папярэднім годзе.

Крэдытовы Камітэт на працягу сваёй працы меў 15 паседжаньняў. Тры заявы на пазычкі былі адкінуты, адна — затрымана для далейшага палагоджаньня.

Падчас працаў сходу было дакладна выясьнена сябром адносна забясьпечаньня на ўложаныя грошы, г. зв. пратэкцыі пазычак па 2 000 дал. на асобу а таксама забясьпечаньня 5 000 дал. на трох чалавек управы, што маюць заўсёды справы з грашыма.

Сябры таксама цікавіліся чэкавым контам. Справа ў тым, што шматлікія сябры хацелі-б, каб укладаючы свае ашчаднасьці ў Касу, яны самі маглі выпісваць, калі жадаюць, чэкі для сваіх патрэбаў. Выясьнілася, што ня толькі наша Беларуская Каса Самапомачы, што мае малы капітал, але навет такія вялікія касы, што маюць каля аднаго мільёну абароту на год, ня могуць пазволіць сабе на сяброўскія чэкі. Каб мець чэкавыя конты для сяброў, трэба было-б у касе мець вялікі капітал на такія малакантраляваныя ёю абароты. Пры гэтым справу трэба было-б студыяваць, каб прыблізна ведаць пры якім капітале можна адкрыць чэкавыя конты.

Цяпер-жа, калі хто-небудзь із сяброў Беларускае Касы Самапомачы мае якія сталыя выдаткі, як прыкладам рэгулярная сплата даўгоў за дом, то можа ўкладаць у Касу ўсе свае ашчаднасьці й толькі даць скарбніку ўказаньні, калі мае сплачываць доўг і на які адрас і справа будзе заўсёды дагледжана.

Як у справаздачы Дырэкцыі Касы так і Кантрольнай Камісіі была адзначана прыкладная і ахвярная праца а. Міхаіла ў мінулым годзе, як скарбніка Касы і сп-ра Я. Чорнага — сакратара.

Пасьля выбараў уканстытуаваліся наступныя кантрольныя і кіраўнічыя органы:

Дырэкцыя Касы: мгр. А. Грыцук — старшыня, а. Міхаіл — скарбнік, сп-ня Н. Слаўко — сябра, сп-р Я. Чорны — сакратар, сп-р В. К-ч — сябра перавыбраны на далейшыя тры гады.

Кантрольная Рада: старшыня на наступныя тры гады — мгр. М. Арцюх, сябра на тры гады сп-р А. Лабэцкі, і на адзін год — сп-р Н. Сільвановіч.

Пазычковая Камісія: сп-р Ліс — на тры гады, сп-р Маркевіч — адзін год, сп-р М. Ганько — два гады.

Зьезд прайшоў вельмі пасьпяхова. Сябры Касы, а разам із імі ўсё беларускае грамадзтва яшчэ раз пераканалася, што Каса прыносіць вялікую карысьць усім нам і ёсьць усе дадзеныя, што і далей таксама добра будзе расьці як у мінулым. Дай Божа!

Гадзіны ўрадаваньня Касы, як і раней — ў пятніцу між гадз. 7-й і 9-й вечарам у Беларускім Доме на 1000 Дандэс вул. Вэст. Тэлефон канцылярыі Ленокс 4-6873.

Ува ўсіх справах, зьвязаных з ашчаднасьцямі й пазычкамі, ці з уступленьнем у Касу зьвяртацца трэба да а. Міхаіла — скарбніка, або сп-ра Я. Чорнага — сакратара.

М. К-р

Аб падручніках і дапаможніках беларускай мовы

Выкладаньне беларускай мовы ў школах БССР выклікае трывогу ня толькі ў саміх выкладчыкаў, але і ў некаторых афіцыйных органах улады, асабліва ў Міністэрстве Асьветы БССР. Гутарка ідзе ня толькі аб якасьці выкладаньня беларускай мовы, але аб адсутнасьці добрых, навукова апрацаваных падручнікаў беларускай мовы.

Загадчык катэдры беларускай мовы Магілёўскага пэдінстытута Юргілевіч у сваім лісьце ў «Зьвязду» ўздымае трывогу аб дрэнным стане выкладаньня беларускай мовы й заклікае беларускіх моваведаў «стварыць поўнацэнныя падручнікі».

Ён піша: «Штогоднія экзамены паказваюць, што многія вучні маюць слабыя веды па беларускай мове. Такое становішча можна вытлумачыць тым, што ў выкладаньні гэтай важнай дысцыпліны дапускаецца фармалізм і начытніцтва».

І далей:

«Да сёньняшняга дня мы ня можам пахваліцца паўнацэннымі падручнікамі беларускай мовы. Зусім няма навуковага дапаможніка гістарычнай граматыкі беларускай мовы, сучаснай беларускай мовы, хоць яны вельмі патрэбны выкладчыкам сярэдняй школы, ня кажучы ўжо аб вышэйшых навучальных установах. А такая дысцыпліна, як дыялекталёгія, выкладаецца ня толькі без падручніка, але нават і без праграмы».

Дзе-ж прычына гэтай ненармальнай зьявы? Прычына ў тым, што як сьцьвярджае Юргілевіч, Міністэрства Асьветы БССР ня хоча выдаваць ні падручнікаў, ні дапаможнікаў беларускай мовы. Навет дапаможнік сучаснай беларускай мовы, які напісаны самім Юргілевічам паводля даручэньня Міністэрства Асьветы й які атрымаў шмат дадатных рэцэнзіяў высокакваліфікаваных спэцыялістых, да апошняга часу ня выдадзены.

Як бачым, загадчык катэдры беларускай мовы намаляваў, праўда, няпоўны, але даволі сумны абраз выкладаньня беларускай мовы ў школах і ня менш сумны абраз беларускага мовазнаўства нагул.

Юргілевіч ня мог даць праўдзівых высноваў, ня мог паказаць зь якіх прычынаў беларускія моваведы ня могуць напісаць добрых, навукова абгрунтаваных падручнікаў беларускай мовы, а выкладчык — дасягнуць добрых посьпехаў сваіх вучняў у гэтай дысцыпліне.

Вінаватыя тут не «фармалізм і начытніцтва», а бальшавіцкая палітыка ў дачыненьні да мовы беларускага народу. КПСС не зацікаўлена разьвіцьцём і навуковым дасьледваньнем беларускай мовы. Адзінай мэтай партыі й савецкага мовазнаўства зьяўляецца гэтак званае «набліжэньне» беларускай мовы да мовы расейскай з мэтай поўнай бальшавізацыі й зьліквідаваньня ў камуністычнай будучыні ў пляне стварэньне гэтак званага «савецкага чалавека» з адзінай мовай...

І таму няма нічога дзіўнага, што падручнік беларускай мовы, якім-бы добрым ён ні быў, як, прыкладам, падручнік Юргілевіча, ня можа пабачыць сьвету. Дык хіба-ж можна гаварыць ува ўмовах бальшавіцкай дыктатуры аб разьвіцьці нацыянальнай культуры й мовы народу, як душы нацыі?

Ленінская нацыянальная палітыка, якой падпіраецца Хрушчоў і КПСС, ня мае нічога супольнага зь інтарэсамі беларускага народу, як і наагул — зь інтарэсамі паняволеных бальшавізмам народаў. Нацыянальная свабода прыдзе толькі пасьля ліквідацыі камуністычнай дыктатуры ўва ўмовах дэмакратычнага ладу.

С. М.

Камунікат ССФ

Галоўная Ўправа Студэнцкага Стыпэндыяльнага Фонду пры Цэнтралі Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў на Чужыне падае да ведама ўсім даўжнікам Фонду, што ўсе дамаганьні звароту зацягнутых пазыкаў ёсьць абаснаваныя ўласнаручна падпісанымі забавязаньнямі даўжнікоў, якія перахоўваюцца ў Галоўнай Управе. Кажны даўжнік можа атрымаць дакладную дату выплачанай яму сумы, а нат у некаторых выпадках ведама нам на якую мэту былі ўжытыя пазычаныя грошы, як, прыкладам, на аплату сэмэстру ці экзамінацыйных коштаў. Дзеля гэткай дакладнай інфармацыі старшыня Філіі ССФ на ЗША Др. А. Вярбіцкі атрымаў ад нас дэтальную лісту ўсіх пазыкаў кажнага даўжніка. Управа ССФ просіць ветліва ўсіх паважаных даўжнікоў ня вымагаць ад нас фатакопіяў зложаных некалі забавязаньняў, бо гэта наносіць непатрэбныя кошты ды пакідае ўва ўсіх ганаровых працаўнікоў ССФ нясмак недаверу, недаверу да студэнцкае арганізацыі, якая так эфэктоўна памагала й верыла ды верыць даўжніку, бо доўг студэнцкі — гэта доўг ганаровы.

Управа перакананая, што выпадак ці выпадкі, калі даўжнік пасьля атрыманьня жаданых ім фатакопіяў ягоных забавязаньняў замоўквае й перарывае ўсялякую карэспандэнцыю з адміністрацыяй Фонду, выклічуць агульнае абурэньне нашай грамадзкай апініі на чужыне. Такое паступаньне няголнае гонару ні акадэміка, ні былога студэнта.

Як ня дзіўна, але даводзіцца прыпамінаць некаторым даўжнікам ССФ дату грашовае рэформы ў Нямеччыне. Яна адбылася 20 чэрвеня 1948 г. Усе пазыкі перад гэтай датай выплочваліся ў РМ, а пасьля яе — у ДМ.

Управа лічыць на поўную падтрымку беларускай грамадзкай апініі на чужыне ў нашым супраціве нікчэмным заявам, зь якіх адна ўжо мела месца, калі даўжнік, магістар эўрапэйскага ўнівэрсытэту, закончыўшы акадэміцкія студыі, адмовіўся зьвярнуць у касу ССФ невялікі доўг, матывуючы тым, што дарэформная нямецкая валюта ня мела ніякай вартасьці. ССФ аплаціў гэтаму студэнту сэмэстар і, такім чынам, ураТаваў яго ад зчыркненьня зь лісты студыюючых.

Апошні абзац поўнага тэксту забавязаньня гучыць: «За падставу разьліку прымаецца даляр ЗША, паводля афіцыяльнага курсу ў часе выплаты стыпэндыі». Управа ССФ прыняла курс разьліку пасьля дакладных інфармацыяў аб пераліках робленых самымі Амэрыканцамі ў Нямеччыне: адзін даляр за 10 РМ, а потым адзін даляр за за 3 ДМ. Курс даляр — ДМ быў вельмі стабільны ў часе выплатаў робленых ССФ і таму Ўправа ССФ абсалютна выключае ўсялякія торгі за курс пераліка. Такую інструкцыю атрымаў ад нас і старшыня Філіі ў ЗША.

Даўжнік можа прасіць адміністрацыю ССФ разлажыць яму сплату доўгу на раты, але ніколі ня можа ён дыктаваць ні курсу разьліку, ні суму свайго задоўжаньня. Вялікая колькасьць даўжнікоў, якія ганарова ўрэгулявалі свае задаўжэньні, мела-б права супрацівіцца ўсялякім хістаньням і зьменам робленым адміністрацыяй ССФ.

Управа ССФ пайшла на максімум магчымай палёгкі й зразуменьня для сваіх даўжнікоў, рэдукуючы на 50 працэнтаў стыпэндыі І-ай катэгорыі ў вышыні ад 700 да 900 РМ, выплачаных коратка перад грашовай рэформай, бяручы на ўвагу, што студэнт, атрымаўшы такую стыпэндыю, ня змог да часу рэформы выкарыстаць больш за палову гэтай сумы. Рэдукцыя гэтая адносіцца вылучна да стыпэндыстых І-ай катэгорыі.

На аснове ўжо зьвернутых даўгоў і зробленых дэклярацыяў аб іх сплаце. Управа ССФ верыць, што цяжкасьці могуць паўстаць толькі ў выняткових выпадках, дзе давяздецца прымяняць санкцыі ганаровыя, адміністрацыйныя ды эвэнтуальна праўныя.

Апіраючыся на дасьветчаньнях мінулага, Управа перакананая ў пазытыўным водгуку беларускага грамадзтва на чужыне на кажны заклік Студэнцкага Стыпэндыяльнага Фонду, ці яго прадстаўніцтваў.

Усім дасюлешнім ахвярадаўцам і сумленным даўжнікам, якія прыкладна адгукнуліся на заклік адміністрацыі ССФ, выказваем тут шчырую падзяку ды просім іх і надалей заставацца нашымі супрацоўнікамі.

Мы выразім напэўна апінію бальшыні, калі скажам, што Студэнцкі Стыпэндыяльны Фонд на чужыне не павінен зьлікв'давацца разам з даўгамі былых студэнтаў, але павінен абавязкава разьвіцца ў моцную арганізацыю. Беларускае студэнцтва закаранілася ўжо амаль на ўсіх высокіх школах сьвету, а таму Студэнцкі Стыпэндыяльны Фонд мае вялікую ролю й вялізарнае поле дзеяньня. Заданьне сваё ён выканае, калі будзе моцнай арганізацыяй як фінансава так і маральна.

Усіх даўжнікоў з эўрапэйскіх краінаў, з Канады, й Аўстраліі просім рэгуляваць іхныя задоўжаньні з прадстаўніком ССФ у іхнай краіне, адрас якога будзе пададзены разам зь лістай доўгу, або із старшынём і выконваючым абавязкі скарбніка а. Др. Аўгенам Смаршчком перасылаючы грошы на:

BANQUE DE BRUXELLES,
ANWERS (ANTWERPEN), C.C.P. 318,
Succursale de Malines, Konto B. 157.42.

За Управу ССФ
а. Др. Аўген Смаршчок

НАШЫЯ ПРАДСТАЎНІЦТВЫ

АНГЕЛЬШЧЫНА:
Mr. Aleksander Laszuk, 97 Moore Park Rd, London, S. W. 6.

АРГЕНТЫНА:
Asociacion Bielorusa en la Argentina, Calle Coronel Sayos 2877, Valentin Alsina, p-cia Buenos Aires.

АЎСТРАЛІЯ:
Mr. A. Vasilenia, 39 Edwin St. Croydon, N. S. W.
Mr. A. Moroz, 109 Morrison Rd, Midland Junction, Western Australia.
Mr. M. Palashuk, 14 Steel St., Spotswood-Melbourne, Vic.

БРАЗЫЛІЯ:
C. Cimafiejcyk, Prasa 76, Tiridentes, Curitiba — Parana.

ЗАДЗІНОЧАНЫЯ ШТАТЫ:
Mr. L. Bielenis, 2042 W. St. Paul Ave, Chicago 47, Illinois.
Mr. B. Danilovich, 303 Howard St., New Brunswick, N. J.
Mr. Ul. Duniec, 814 Brayton Ave. Cleveland 13, Ohio.

КАНАДА:
Mrs. N. Akula, 57 Riverdale Ave. Toronto, Ont.

НОВАЯ ЗЭЛЯНДЫЯ:
Mr. Marian Karanieuski, 88 Hercules Drayve, Roxburg — Hydro.

ФРАНЦЫЯ:
Mr. V. Mickievič, 47, Bd de Bezons Sartrouville (S. et O.).
Mr. M. W. Kastelan, 2, Rue Galvani Roubaix (Nord).

1848 год у Беларусі

(Заканчэньне з 3-яй бачыны)

дзе. У жніўні 1849 году шэф корпусу жандараў граф Арлоў даносіў цару аб распаўсюджаньні сярод насельніцтва Заходняга краю рэвалюцыйных вершаў, якія заклікаюць да ўзбраеньня й далучэньня да паўстаўшых народаў Эўропы.

Грамадзка-палітычны рух у Беларусі ў 1848 годзе ня перарос у рэвалюцыю; тут яшчэ ня было умоваў для яе. Рух быў разрозьнены, неарганізаваны. Асобныя выступы лёгка падаўляліся ўладамі. Аднак неспакой, які быў выкліканы ў царскім урадзе падзеямі 1848 году на Беларусі, сьветчыць аб іх значнасьці.

10 год таму «Бацькаўшчына» пісала:

✳ ...Бязупынна гарыць і палае гэты няўгасны агонь-зьніч нацыянальнае нашае гаспадарстваўшчыны. Дармо, што тыя-ж злыя, няспрыяльныя віхуры не далі яму ўгарэцца там, на Бацькаўшчыне, загасіўшы-заліўшы груба й без пары лютымі свайміі наваламі. Вынесены з Бацькаўшчыны на чужыну й выгнаньне вернымі сынамі ў каганцох-сьветачах, у іскрамётных паходнях, пераношаны часта зь месца на месца, перадаваны з рук старэйшых у маладзейшыя й дужэйшыя рукі — гарыць ён і сяньня ў гэтых трох, сьвятых для кажнага сьведамага суродзіча літарах **БНР.**

✳ ...Яшчэ могуць знайсьціся дабрадушныя дурні, або проста злачынцы роду людзкога, якія захочуць шукаць із «дэмакратычным» Сталінам паразуменьня.

✳ ...Апошнім часам вельмі заактывізаваліся гамбурскія «истинно-русские». Разаслаўшы ўсюды сваіх агентаў, ловяць у свае сеці Беларусаў і Ўкраінцаў усялякімі магчымымі спосабамі.

№ 5 (8), 22 лютага 1948 г.

Фэльетон

Дыялектыка

Ня слухайце, браткі мае, ніколі ня слухайце таго, хто вам кажа, што камуністычная дыялектыка зьяўляецца быццам-бы надта-ж складанай філязафічнай навукай, што да яе немагчыма дапяць простым розумам, бо ці галаву сабе скруціш, ці ў вар'яцкі дом на адпачынак паедзеш! Хлусьня гэта ўсё, дальбог хлусьня! На ўсім сьвеце ня знойдзеце сяньня прасьцейшай рэчы, як гэтая дыялектыка. Усё ў ёй ясна, выразна ды зразумела ня толькі даросламу чалавеку, але навет і трохгадоваму дзіцяці.

Але, пэўна-ж дзеля поўнага разуменьня гэтае навукі, трэба верыць, і верыць не абы-як, а гэтак як дзеці — не задумоўваючыся над тым, што праўдзіва, а што не...

Нездарма-ж у нашым народзе пра гэтую дыялектыку кажуць, як пра тое дышла — «куды папхнеш, туды й выйшла..»

Эт, ды што тут шмат філязафаваць на гэтую няфілязафічную тэму! Адчынеце, калі ласка, славутую кнігу несьмяротна-памерлага «вялікага й мудрага» Сталіна — «Эканамічная праблема сацыялізму ў СССР», і на бачыны 91 кінецца вам у вочы гістарычны сказ: «Перадача калгасам на собскасьць машынаў аддаліла-б калгасную собскасьць ад агульнанароднай і прывяла-б не да прыбліжэньня да камунізму, а наадварот, да аддаленьня ад яго».

Вось, бачыце, як моцна сказана, як сякерай адрублена! Усё ясна й зразумела. Калі, скажам, які калгас праз дурніцу трактар на собскасьць сабе купіў-бы, дык ён, значыцца, не да камунізму на гэтым трактары даехаў-бы, а да самога капіталізму. А тут ужо не да жартаў, бо магло скончыцца «масавым перасяленьнем» усяго калгасу ў краіну белых мядзьведзяў. Дый што гаварыць, дыялектыка была простая — купіш трактар, дык у Сібіры пехатой хадзіць будзеш...

«Ага, — скажаце вы, — а што гэта цяперака рабіць, калі сам Хрушчоў у Менску загадаў трактары ды розныя там сельскагаспадарчыя прылады купляць?». А нічога, купляйце, калі маеце за што купляць! Купляйце, бо і ў гэтым ізноў-жа дыялектыка простая й зразумелая: чым больш вы купіце трактараў, тым далей ад'едзеце ад камунізму! А каб, скажам, на кажнага калгасьніка па трактару давялося, дык зматарызаванай сялянскай масай лягчэй было-б ня толькі выйсьці з калгасу, але навет і выехаць зь яго!

А што там да якога сумлеву ці страху, дык гутаркі цяпер ня можа быць — сам-жа Хрушчоў загадаў, няхай ён і адказвае. Праўда, можа здарыцца, што на «сяньняшнім этапе разьвіцьця камуністычнае дыялектыкі» ён памыліўся, як памыліліся ў свой час ягоныя сябры ды найдепшыя вучні «вялікага вучыцеля» — Бэрыя, Молатаў, Маленкоў — але нас ужо гэта не абходзіць. Няхай ён там сабе мыляецца, а мы — парадуемся, бо гэтыя МТС 30 гадоў на шыі калгасьнікаў сядзелі ды людзей да голаду даводзілі, адбіраючы аж 50 працэнтаў натураплаты з ураджаю...

Пакончыць трэба зь імі, зьліквідаваць гэтых паразытаў-МТС як клясу! А дзень канчатковай ліквідацыі МТС, бяз усялякае там дыялектыкі належала-б абвесьціць днём вялікай урачыстасьці. І ў гэты рэвалюцыйны дзень варта было-б узьняць на хвіліну з дамавіны Ўладзімера Маякоўскага, каб ён, значыцца, грымнуў хвальбу сваім трыбунным голасам, накшталт гэтага:

Віншую сялянаў
і іншую масу!
У нашай краіне
вялікі
прагрэс, —
Хрушчоўскімі словамі
сьцерці,
як клясу,
З калгаснай зямлі
недарайд —
МТС!

Шкада толькі, што асноўная маса калгасьнікаў зь вялікім недаверам адносіцца да гэткіх рэвалюцыйных зьменаў, паціскае плячыма ды ня ведае «што да чаго й на якое ліха здалося»... А які-небудзь, скажам, адважны вясковы гарманісты можа часам і маскоўскай частушкай папытацца:

Растлумачце, грамадзяне, —
Хто — у поле, хто — у лес?
Ўчора Бэрыю зьнішчалі,
А сягодня — МТС.

І, пэўна-ж, адкажуць яму хорам калгасьнікі:

Грай гармоніка старая
Ды рыпі на ўсе лады...
Наша доля ўжо такая —
Толькі... слухай ды маўчы!

Аўген Кавалеўскі

БАЦЬКАЎШЧЫНА

Беларускі тыднёвік палітыкі, культуры й грамадзкага жыцьця.
Выдавец: Уладзімер Бортнік
РЭДАГУЕ КАЛЕГІЯ

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011